УДК 37.016:811.161.3

Н. Л. Прасаловіч (Магілёў)

# ПЕДАГАГІЧНЫ ВОПЫТ РЭАЛІЗАЦЫІ ІНАВАЦЫЙНАГА ПРАЕКТА «ФАРМІРАВАННЕ МЕТАДАЛАГІЧНАЙ КУЛЬТУРЫ ВУЧНЯЎ ПА СРОДКАХ ВЫКАРЫСТАННЯ ТЭХНАЛОГІІ РАЗВІЦЦЯ КРЫТЫЧНАГА МЫСЛЕННЯ НА ЎРОКАХ БЕЛАРУСКАЙ МОВЫ»

**Анатацыя.** У артыкуле разглядаецца вопыт фарміравання метадалагічнай культуры вучняў па сродках выкарыстання тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо, прыводзяцца асноўныя прыёмы і метады тэхналогіі, прыклады ўжывання прыёмаў тэхналогіі на ўроках беларускай мовы. Адзначаецца, што фарміраванне крытычнага мыслення садзейнічае развіццю метадалагічнай культуры вучняў.

**Summary.** This article deals with the experience of formation of students' methodological culture by means of applying critical thinking via reading and writing, main methods of the critical thinking, provides examples of applying the methods of the instructional device at the Belarusian language lessons. The author notes that the formation of critical thinking contributes to the development of students' methodological culture.

**Ключавыя словы:** метадалагічная культура, кампетэнтнасны падыход, ключавыя кампетэнцыі, тэхналогія развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо, метады і прыёмы тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення.

**Keywords:** methodological culture, competence approach, key competencies, technology development of critical thinking through reading and writing techniques and the development of technology techniques of critical thinking.

Выхаванне кампетэнтнага чалавека – гэта галоўная мэта адукацыйнага працэсу ў сэрэдняй школе. Грамадства жадае бачыць у выпускніку асобу кампетэнтную, са сфарміраванымі камунікатыўнымі навыкамі, якая можа працаваць у камандзе, браць на сябе адказнасць за вырашэнне праблем, гатова да самаадукацыі. Ад сучаснага чалавека патрабуюць крэатыўнага мыслення, устойлівага навыку самааналізу, рэфлексіі.

Кампетэнтнасны падыход прадугледжвае ўмелае спалучэнне метадаў і прыёмаў работы, таму выкарыстанне тэхналогіі «Развіцця крытычнага мыслення праз чытанне і пісьмо» (ТРКМЧП), асноўнымі ідэямі якой з'яўляецца прыярытэт меркавання кожнага вучня, не аўтарытарнасць настаўніка, апора новых ведаў на папярэдні вопыт, на маю думку, дапамагае настаўніку зацікавіць вучня працэсам пошуку і дае магчымасць цеснаму супрацоўніцтву паміж настаўнікам і вучнем.

Пад тэхналогіяй РКМЧП мы разумеем сістэму канкрэтных метадычных стратэгій. Тэхналогія крытычнага мыслення дазваляе вырашаць задачы адукацыйнай матывацыі (павышэнне цікавасці да працэсу навучання і актыўнае ўспрыманне вучэбнага матэрыялу), маўленчай культуры (фарміраванне навыкаў напісання тэкстаў розных жанраў); інфармацыйнай пісьменнасці (развіццё здольнасці да самастойнай аналітычнай і ацэначнай работы з інфармацыяй любой складанасці); ***сацыяльная кампетэнтнасць (фарміраванне камунікатыўных навыкаў і адказнасці за веды).***

Такім чынам, працуючы па тэхналогіі РКМЧП, настаўнік мовы развівае агульныя ключавыя кампетэнцыі:

− пазнавальная кампетэнцыя (вучэбныя дасягненні, інтэлектуальныя заданні, уменні вучыцца і прымяняць веды);

− асобасная кампетэнцыя (развіццё індывідуальных якасцей, таленту, здольнасці да рэфлексіі, дынамічнасць ведаў);

− самаадукацыйная кампетэнцыя (самаразвіццё, уменне прымяняць навыкі ва ўмовах хуткіх змен, самааналіз);

− сацыяльная кампетэнтнасць (уменне працаваць у камандзе, здольнасць прымаць уласныя рашэнні, уменне вызначаць асабістую ролю ў грамадстве, развіццё асабістых якасце);

Адзінага вызначэння тэрміна "крытычнае мысленне" няма. Можна вылучыць пяць складнікаў гэтага паняцця [1].

Па-першае, крытычнае мысленне ёсць мысленне самастойнае. Калі занятак будуецца на прынцыпах крытычнага мыслення, кожны фармулюе свае ідэі, адзнакі і перакананні незалежна ад астатніх. Ніхто не можа думаць больш крытычна за нас, мы робім гэта выключна для саміх сябе. Такім чынам, мысленне можа быць крытычным толькі тады, калі яно носіць індывідуальны характар. Вучні павінны мець досыць волі, каб думаць уласнай галавой і самастойна вырашаць нават самыя складаныя пытанні.

Па-другое, інфармацыя з'яўляецца першым, а зусім не канчатковым пунктам крытычнага мыслення. Веданне стварае матывацыю, без якой чалавек не можа думаць крытычна. Як часам гавораць, "цяжка думаць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А. А. Кулешова

з пустой галавой". У сваёй пазнавальнай дзейнасці вучні і настаўнікі, пісьменнікі і навукоўцы падвяргаюць кожны новы факт крытычнаму абдумванню. Менавіта дзякуючы крытычнаму мысленню традыцыйны працэс пазнання здабывае індывідуальнасць і становіцца асэнсаваным, бесперапынным і прадуктыўным.

Па-трэцяе, крытычнае мысленне пачынаецца з пастаноўкі пытанняў і ўсведамлення праблем, якія трэба вырашыць. Цікаўнасць – уласціва любой чалавечай істоце ад прыроды. Мы заўважаем нешта новае – і жадаем даведацца, што гэта такое. Па меркаванні амерыканскага філосафа і педагога Д'юі., факусіроўка на праблемах стымулюе прыродную дапытлівасць вучняў і заахвочвае іх да крытычнага мыслення. Пры падрыхтоўцы да заняткаў настаўнік павінен вызначыць кола праблем, з якімі сутыкаюцца вучні, а ў далейшым, калі вучні будуць да гэтага гатовыя, дапамагчы ім сфармуляваць гэтыя праблемы самастойна. Дзякуючы крытычнаму мысленню вучэнне са штодзённай школьнай працы ператвараецца ў мэтанакіраваную, змястоўную дзейнасць, дзе вучні робяць рэальную інтэлектуальную працу і знаходзяць выйсці з рэальных жыццёвых праблем. Збіраючы дадзеныя, аналізуючы тэксты, супастаўляючы альтэрнатыўныя пункты погляду і карыстаючыся магчымасцямі калектыўнага абмеркавання, яны шукаюць і знаходзяць адказы на хвалюючыя іх пытанні.

Па-чацвёртае, крытычнае мысленне імкнецца да пераканаўчай аргументацыі. Чалавек, які мысліць крытычна, знаходзіць уласнае рашэнне праблемы і падмацоўвае гэта рашэнне разумнымі, абгрунтаванымі доказамі. Ён таксама ўсведамляе, што магчымыя іншыя рашэнні той жа праблемы, і імкнецца давесці, што прапанаванае ім рашэнне больш лагічнае і рацыянальнае, чым іншыя.

І, нарэшце, па-пятае, крытычнае мысленне ёсць мысленне сацыяльнае. Усякая думка правяраецца і адточваецца, калі ёю дзеляцца з іншымі. Калі мы спрачаемся, чытаем, абмяркоўваем, пярэчым і абменьваемся меркаваннямі з іншымі людзьмі, мы ўдакладняем і паглыбляем сваю ўласную пазіцыю. Працуючы па тэхналогіі РКМЧП, я заўсёды выкарыстоўваю на сваіх занятках разнастайныя варыянты парнай і групавой працы, часам праводжу дэбаты і дыскусіі, а таксама імкнуся разнастаіць віды пісьмовых прац навучэнцаў.

У сваёй педагагічнай дзейнасці імкнуся вучыць дзяцей самім арганізоўваць сваю дзейнасць: вызначаць тэму, ставіць мэты, планаваць работу, аналізаваць, бачыць праблемы, будаваць гіпотэзы, доказваць іх ці абвяргаць, прымяняць атрыманыя веды на практыцы. Ключавыя кампетэнцыі фарміруюцца толькі ў вопыце ўласнай дзейнасці, таму адукацыйнае асяроддзе павінна арганізоўвацца такім чынам, каб дзіця трапляла ў сітуацыі, якія спрыяюць яго станаўленню.

Мне падабаюцца дынамічныя ўрокі, рабочая атмасфера, дзе дзеці не толькі слухаюць і запамінаюць, але і актыўна самі здабываюць веды. Кампетэнтнасны падыход у навучанні школьнаму курсу беларускай мовы я рэалізоўваю праз выкарыстанне прыёмаў і метадаў тэхналогіі РКМЧП. Гэтыя прыёмы і метады прывабліваюць мяне сваёй нестандартнасцю, адкрываюць вялікія практычныя магчымасці, спрыяюць развіццю творчасці, пераадоленню пасіўнасці дзяцей на ўроках, павышэнню якасці ведаў па прадмеце, тым самым фарміруюць і развіваюць ключавыя кампетэнцыі ў навучэнцаў.

Тэхналогія развіцця крытычнага мыслення мае наступную структуру [2; 3]:

| **Тэхналагічныя этапы** | | |
|---|---|---|
| **І стадыя** | **ІІ стадыя** | **ІІІ стадыя** |
| Выклік:<br>- актуалізацыя ведаў;<br>- абуджэнне цікавасці да атрымання новай інфармацыі;<br>- пастаноўка вучнем уласных мэт навучання. | Асэнсаванне зместу:<br>- атрыманне новай інфармацыі;<br>- карэкціроўка вучнем пастаўленых мэт навучання. | Рэфлексія:<br>- роздум, нараджэнне новых ведаў;<br>- пастаноўка вучнем новых мэт навучання. |

Прыёмы тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення

І стадыя выкліку

Стадыю выкліку на ўроку можна ажыццявіць многімі метадамі, у тым ліку і добра вядомымі, напрыклад, "Ключавыя словы", па якіх можна прыдумаць апавяданне або расставіць іх у пэўнай паслядоўнасці, а затым, на стадыі асэнсавання шукаць пацвярджэнне сваім меркаванням.

Прыём "Правільныя і няправільныя сцвярджэнні" або "ці верыце вы" можа быць пачаткам урока. Вучні, выбіраючы "правільныя сцвярджэнні" з прапанаваных настаўнікам апісваюць тэму (сітуацыю, сістэму правілаў). Затым настаўнік просіць вучняў высветліць, ці правільныя дадзеныя сцвярджэнні, пацвярджаючы свой адказ. Пасля знаёмства з асноўнай інфармацыяй (тэкст параграфа, лекцыя па дадзенай тэме) настаўнік з вучнямі вяртаецца да сцвярджэнняў і вучні ацэньваюць іх дакладнасць, выкарыстоўваючы атрыманую на ўроку інфармацыю.

- Ці верыце, што дзеепрыметнік – гэта самастойная часціна мовы?
- Ці верыце, што дзеепрыметнік – гэта форма дзеяслова?
- Ці верыце, што абазначаюць дзеепрыметнікі дзеянне прадмета?
- Ці верыце, што дзеепрыметнікі абазначаюць пастаянную прымету?
- Ці верыце, што дзеепрыметнік адказвае на пытанні ўскосных склонаў?
- Ці верыце, што дзеепрыметнікі бываюць пераходнымі?
- Ці верыце, што могуць быць дзеепрыметнікі якаснымі?



Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

– Ці верыце, што дзеепрыметнік адказвае на пытанні Які? Якая? Якія?
– Ці верыце, што дзеепрыметнікі могуць быць загаднага ладу?

Прыём “Дрэва прадказанняў” дапамагае выказваць меркаванні па развіцці сцэнарыя ўрока (пры вывучэнні мовы) або сюжэтнай лініі ў апавяданні, аповесці (пры вывучэнні літаратурных твораў). Правілы работы з дадзеным прыёмам такія: ствол дрэва – тэма, галінкі – меркаванні, якія вядуцца па двух асноўных накірунках: “магчыма” і “пэўна” (колькасць галінак неабмежаваная), і “лісты” – доказы гэтых меркаванняў, аргументы на карысць той або іншай думкі.

Табліца-сінтэз

Гэты цікавы прыём быў прапанаваны экспертам Санкт-Пецярбургскай рэгіянальнай групы Загашавым І. і рэкамендуецца для работы з мастацкім тэкстам. На стадыі выкліку настаўнік прапануе вучням тэму або пытанні, якія адлюстроўваюць асноўны змест тэксту. Вучням прапануецца падабраць ключавыя словы, фразы, якія, як ім здаецца, могуць быць апорнымі ў тэксце, які будзе вывучацца. Вучні самастойна (або ў групе) запаўняюць верхнюю частку першай графы табліцы, далей прапануецца сам тэкст. Пасля чытання або слухання тэксту табліца запаўняецца поўнасцю.

| Ключавыя словы (словазлучэнні) да чытання | Вытрымкі з тэкста (звязаныя з ключавымі словамі) | Чаму гэтая цытата значная для мяне (думкі, роздумы) |
|---|---|---|
| 1. ................................<br>2. ...............................<br>/падчас чытання/<br>1. ..............................<br>2. ............................... | | |

Падчас працы з інфармацыйным тэкстам прапануецца іншы варыянт “табліцы-сінтэз”:

| Ключавыя словы | Тлумачэнне | Вытрымкі з тэксту |
|---|---|---|

II стадыя асэнсавання

Прыём “Кластар” – выдзяленне сэнсавых адзінак тэкста і графічнае афармленне ў пэўным парадку ў форме гронкі. Гронкі – графічны прыём у сістэматызацыі матэрыялу, калі думкі размяшчаюцца ў пэўным парадку. Правілы вельмі простыя. Малюем мадэль сонечнай сістэмы: зорку, планеты і іх спадарожнікі. У цэнтры зорка – гэта наша тэма, вакол яе планеты – буйныя сэнсавыя адзінкі, злучаем іх прамой лініяй з зоркай, у кожнай планеты свае спадарожнікі, у спадарожнікаў свае. Кластары дапамагаюць вучням, калі падчас пісьмовай работы запас думак заканчваецца. Сістэма кластараў ахоплівае вялікую колькасць інфармацыі ў параўнанні са звычайнай пісьмовай работай. Гэты прыём можа быць выкарыстаны на стадыі выкліку, калі мы сістэматызуем інфармацыю да знаёмства з новай тэмай.




Вялікі патэнцыял мае гэты прыём на стадыі рэфлексіі: гэта выпраўленне няправільных меркаванняў у “папярэдніх кластарах”, запаўненне іх пасля атрымання новай інфармацыі, устанаўленне прычынна-выніковых сувязей паміж асобнымі сэнсавымі блокамі (работа можа праводзіцца індывідуальна, у групах, па ўсёй тэме або па асобных сэнсавых блоках). Вельмі важным момантам з’яўляецца прэзентацыя “новых” кластараў. Задача гэтай формы не толькі сістэматызацыя матэрыялу, але і ўстанаўленне прычынна-выніковых сувязей паміж гронкамі.

Цікавым прыёмам з’яўляецца “Двухчасны дзённік”. Гэты прыём дае магчымасць чытачу звязаць змест тэксту са сваім асабістым вопытам. Двайныя дзённікі могуць выкарыстоўвацца пры чытанні тэксту на ўроку, але асабліва прадуктыўная работа з гэтым прыёмам, калі вучні атрымліваюць заданне прачытаць тэкст вялікага аб’ёму дома.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

| Цытата | Каментарыі |
|---|---|

У левай частцы дзённіка вучні запісваюць тыя моманты з тэксту, якія выклікалі ў іх найбольшае ўражанне, выклікалі нейкія ўспаміны, асацыяцыі з эпізодамі з іх уласнага жыцця, выклікалі пратэст або, наадварот, захапленне, здзіўленне, такія цытаты, на якіх яны "спатыкнуліся". Справа яны павінны даць каментарый: што прымусіла іх запісаць менавіта гэтую цытату. На стадыі рэфлексіі вучні вяртаюцца да работы з звайнымі дзённікамі, пры іх дапамозе тэкст паслядоўна разбіраецца, вучні дзеляцца заўвагамі, якія яны зрабілі да кожнай старонкі. Настаўнік знаёміць вучняў з уласнымі каментарыямі, калі хоча выклікаць увагу вучняў да тых эпізодаў у тэксце, які не агучваліся падчас абмеркавання.

"**Трохчасныя дзённікі**" маюць трэцюю графу – "лісты да настаўніка". Гэты прыём дазваляе працаваць не толькі з тэкстам, але і праводзіць дыялог з настаўнікам аб прачытаным.

| Цытата | Каментарыі. Чаму менавіта на гэтай цытаце вы спынілі ўвагу? | Пытанні да настаўніка |
|---|---|---|

Прыём "Тоўстыя і тонкія пытанні" можа выкарыстоўвацца на любой з трох фаз урока: на стадыі выкліку – гэта пытанні да вывучэння тэмы, на стадыі асэнсавання – спосаб актыўнай фіксацыі пытанняў падчас чытання, слухання, падчас рэфлексіі – дэманстрацыя разумення вывучанага.

| Тоўстыя? | Тонкія? |
|---|---|
| 1. Дайце 3 тлумачэнні, чаму дзейнік і выказнік не з'яўляюцца словазлучэннем ? | 1. Якая часціна мовы абазначае прадмет? |
| | 2. Што абазначае асабовы назоўнік? |
| 2. Растлумачце, чаму паміж часткамі складаных сказаў трэба ставіць знакі прыпынку? | 3. Калі назоўнік выконвае ролю дзейніка? |
| | 4. Якім членам сказа можа быць назоўнік? |
| 3. Чаму вы лічыце, што назоўнік можа выконваць ролю звароткa? | 5. Можа назоўнік выконваць ролю выказніка? |
| 4. У чым адрозненне паміж галоўнымі і даданымі членамі сказа? | 6. Ці можа зваротак быць дзейнікам? |

Падчас працы з табліцай у правую графу запісваюцца пытанні, якія патрабуюць простага, аднаскладовага адказу. У левай графе – пытанні, якія патрабуюць падрабязнага разгорнутага адказу.

Зводная табліца

Гэты прыём дазваляе за кароткі час апісаць і вывучыць вялікую колькасць інфармацыі.

| Тэма 1 | Тэма 2 | Лініі параўнання | Тэма 3 | Тэма 4 |
|---|---|---|---|---|

Асноўны сэнс выкарыстання прыёма "Зводная табліца" ў тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення заключаецца ў тым, што "лініі параўнання, г. зн. характарыстыкі, па якіх вучні параўноўваюць розныя з'явы, аб'екты і інш., фармулірують самі вучні. Для таго, каб у якой-небудзь групе "ліній параўнання" не было дужа многа, можна прапанаваць наступны спосаб: вывесці на дошку усе меркаванні вучняў адносна "ліній", а затым папрасіць іх вызначыць найбольш значныя. "Значнасць" неабходна аргументаваць. Такім чынам можна пазбегнуць лішкаў. І зробяць гэта самі вучні. Катэгорыі параўнання можна выдзяляць як да чытання тэксту, так і пасля яго прачытання. Яны могуць быць сфармуляваны як у форме паняццяў, так і ў форме ключавых слоў, а таксама ў любой іншай форме: малюнкі, пытанні, цытаты і г. д.

Табліца «Інсерт»

| " V " | " + " | " - " | " ? " |
|---|---|---|---|
| пастаўце "v" (так) на палях, калі тое, што вы чытаеце, адпавядае таму, што вы ведаеце, або думалі, што ведаеце | пастаўце "+" (плюс) на палях, калі тое, што вы чытаеце, з'яўляецца для вас новым | пастаўце "-" (мінус) на палях, калі тое, што вы чытаеце, супярэчыць таму, што вы ўжо ведалі, або думалі, што ведаеце | пастаўце "?" на палях, калі тое, што вы чытаеце, незразумелае, або вы жадалі б атрымаць больш падрабязныя звесткі па дадзеным пытанні |

| + | ! | ? |
|---|---|---|
| 1. Дзеепрыметнікі бываюць залежнага і незалежнага стану.<br>2. Як і дзеясловы маюць трыванні (зак. і незак.), час (прошлы і цяперашні).<br>3. Як і прыметнікі маюць (род, лік, склон).<br>4. Найбольш ужывальныя дзеепрыметнікі з суфіксамі -ан-, -ен-, -н-, -т-, -л-<br>5. У сказе кароткія дзеепрыметнікі выконваюць ролю выказніка. | **Не (ня)** пішацца <u>разам:</u><br>1. Без **не** не ўжываецца: *неабсяжны, неабдымны, неадольны.*<br>2. З поўнымі дзеепрыметнікамі, калі няма залежных слоў і супрацьпастаўлення (*ненапісанае сачыненне, недагледжаны агарод, нявыдуманая гісторыя*)<br>**Не (ня)** <u>асобна:</u><br>1. З кароткімі дзеепрыметнікамі.<br>2. З поўнымі дзеепрыметнікамі, якія маюць пры сабе залежныя словы.<br>3. З поўнымі дзеепрыметнікамі, калі ёсць у сказе супрацьпастаўленне | З поўнымі дзеепрыметнікамі м.р., калі яны ўжываюцца ў ролі выказніка (*часопіс не прачытаны).*<br>Калі пры дзеепрыметніку стаіць слова са значэннем ступені якасці (*цалкам нявыкананае заданне*). |

Гэты прыём працуе на стадыі асэнсавання. Для запаўнення табліцы трэба зноў вярнуцца да тэкста, такім чынам, забяспечваецца ўдумлівае, уважлівае чытанне. Тэхналагічны прыём "Інсерт" і табліца "Інсерт" зробяць

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова

зрокавымі працэс назапашвання інфармацыі, шлях ад “старых” ведаў да “новых”. Важным этапам работы будзе абмеркаванне запісаў, занесеных у табліцу, або маркіроўкі тэксту.

III стадыя рэфлексіі

Прыём “Кластар”

Прыём “Лаві пытанне”

Мастацкія формы пісьмовай рэфлексіі “Сінквейн”

Жыццёвыя ўражанні нараджаюць перажыванні, таму любы лірычны твор – рэфлексія. Сярод вершаваных форм, заснаваных на рэфлексіі і пабудаваных “па правілах”, мы ведаем не так ужо і многа: японскія танку, хаку, санет. Да такіх форм адносіцца і сінквейн.

Слова сінквейн утварылася ад французскага “пяць”. Гэта верш з пяці радкоў, які будуецца па правілах.

Сінквейн “Дзеепрыметнік”

1. Назоўнік (1назоўнік) – дзеепрыметнік.
2. Прыметнік (2 прыметнікі) – поўны, кароткі, зменны, жывы.
3. Дзеяслоў (3 дзеясловы) – скланяецца, змяняецца, пішацца, утвараеецца, ужываецца.
4. Сказ (фраза з 4 слоў) – дзеепрыметнік змяняецца па склонах.
5. Слова – сінонім да тэмы, над якой працуем – форма дзеяслова.

Мастацкія формы пісьмовай рэфлексіі “Эсэ”

Гэта жанр публіцыстыкі, свабодная трактоўка якой-небудзь тэмы, праблемы. У цяперашні час эсэ часта называюць “паток свядомасці, перанесены на паперу”. Доўгі час гэты жанр не выкарыстоўваўся ў школьным навучанні, цяпер жа настаўнікі актыўна практыкуюць пісьмовыя заданні ў форме эсэ. Калі гэта работа на ўроку, загадзя агаворваюцца часавыя межы яе выканання: 5, 10, 15, 20 мінут (гэта час, адведзены на “свабоднае пісьмо”). У залежнасці ад мэты напісання адбіраецца аўатарм і змест. У гэтым выпадку эсэ – мастацкая форма роздуму.

Мадэль напісання эсэ

1. Папярэдні этап (інвентарызацыя): вычляненне найбольш важных фактаў, паняццяў і г. д.
2. Работа над чарнавіком.
3. Праўка. Можа ажыццяўляцца ў пары ў працэсе ўзаемаабмену..
4. Рэдакціраванне. Выпраўленне заўваг, зробленых падчас праўкі.
5. Публікацыя. Чытанне на аўдыторыю.

Шматлікасць славесных, наглядных і практычных метадаў навучання тэхналогіі развіцця крытычнага мыслення робіць спосабы навучання зусім непадобнымі да стандартных. Навучэнцы атрымліваюць магчымасць самастойна здабываць веды, вучацца слухаць адзін аднаго, робяць вынікі і падагульненні. Настаўнік пры гэтым выконвае ролю каардынатара: ён назірае, аналізуе, карэкціруе, але не навязвае сваё меркаванне. Такая сумесная праца зближае, павышае ўзровень самаадзнакі кожнага вучня, забяспечвае станоўчую дынаміку разумовай дзейнасці вучняў.

Прымяненне прыёмаў тэхналогіі крытычнага мыслення садзейнічае фарміраванню ўніверсальных вучэбных дзеянняў: асобасных (развіццё камунікатыўных навыкаў, культуры зносін, уменне аргументавана адстойваць сваю кропку погляду), метапрадметных (фарміраванне ўмення карыстацца знака-сімвалічнымі сродкамі для далейшага мадэлявання, авалоданне навыкамі асэнсаванага чытання, авалоданне ўменнямі аналізу, сінтэзу, абагульнення), прадметных (новыя веды па канкрэтным прадмеце). І, самае галоўнае, забяспечвае ўключэнне кожнага ў навучальны працэс, дзе праз сваю дзейнасць вучань сам адкрывае і набывае новыя веды. Пры такім сістэмна-дзейнасным падыходзе метадалагічная культура вучняў характарызуецца наступнымі уменнямі: аналізу любой новай сітуацыі навакольнага свету, выяўлення і асмыслення якасных аспектаў праблемы, супастаўлення наглядных і вербальных формаў вучэбнага матэрыялу, арыентацыя ў структуры вучэбнага задання, сувязях яго кампанентаў.

**Літаратура**

1. Клустер, Д. Что такое критическое мышление? / Д. Клустер // Народная асвета. − № 3. – 2004. – С. 81-83.

2. Муштавинская, Н.В. Технология развития критического мышления: научно-методическое осмысление / Н. В. Муштавинская // Методист. – 2002. – № 2. – С. 30-35.

3. Снопкова, Е. И. Педагогические системы и технологии [Электронный ресурс] : учебное пособие / Е. И. Снопкова. – Электрон. данные. – Могилев : МГУ имени А. А. Кулешова, 2017. – 1 электрон. опт. диск (CD-R); 12 см. – Сист. требования: Pentium II 300, 64 Mb RAM, свободное место на диске 16 Mb, Windows 98 и выше, Adobe Acrobat Reader, CD-Rom, мышь. – Загл. с экрана. – 10 экз.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова